## Генеральная асамблея ІКАМОС

**1 — 5 снежня 2002 г.** у Мадрыдзе адбылася XIII Генеральная асамблея Міжнароднага савета па помніках і мясцінах (ІКАМОС), прысвечаная тэме "Стратэгія захавання сусветнай культурнай спадчыны ва ўмовах глабалізацыі. Прынцыпы, практыка, перспектывы". У рабоце Асамблеі бралі ўдзел старшыня Беларускага камітэта Міжнароднага савета па помніках і мясцінах У.Гілеп і саветнік Пастаяннага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь пры ЮНЕСКА А.Істомін.

На форуме былі абмеркаваны пытанні захавання гістарычных паселішчаў, культурнага турызму, архітэктурнай спадчыны XX ст., захавання рэлігійных будынкаў. У рамках Асамблеі прайшла афіцыйная прэзентацыя Беларускага нацыянальнага камітэта, быў праведзены шэраг двухбаковых сустрэч з кіраўнікамі ІКАМОС і прадстаўнікамі нацыянальных камітэтаў еўрапейскіх краін і ЗША.

Заснаваны ў 1965 г. у Варшаве Міжнародны савет па помніках і мясцінах з'яўляецца міжнароднай няўрадавай арганізацыяй, якая імкнецца праз сваю дзейнасць пашырыць сферу выкарыстання тэорыі, метадалогіі і навуковых метадаў у захаванні архітэктурнай спадчыны. Ствараць свае нацыянальныя камітэты ІКАМОС могуць толькі краіны—члены ЮНЕСКА. ІКАМОС валодае асацыятыўным статусам арганізацыі—партнёра ЮНЕСКА, а таксама кансультацыйным статусам Сацыяльна–эканамічнага савета Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. 130 краін свету маюць свае нацыянальныя камітэты гэтай арганізацыі. Беларускі камітэт Міжнароднага савета па помніках і мясцінах створаны ў лютым 2002 г. Галоўная мэта яго дзейнасці — садзейнічаць ахове, захаванню, рэстаўрацыі, рэгенерацыі, рэабілітацыі і павышэнню вартасці гістарычных помнікаў, груп будынкаў і мясцін на нацыянальным і міжнародным узроўнях.